

**164.** Прачытайце, спішыце. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Засп*(е/я)*ваў жаваранак. З лесу павеяла хала*(д/т)*ком. Узышло на небе сонца.

## Словы, якія называюць прыметы прадметаў

**165.** Падбярыце да слоў-назваў іх прыметы.

| | |
|---|---|
| Журавіны | *круглы, румяны, салодкі, сакавіты* |
| Вавёрка | *вялікае, глыбокае, празрыстае, блакітнае* |
| Яблык | *рыжая, маленькая, жвавая, пушыстая* |
| Возера | *буйны́я, чырвоныя, кіслыя, карысныя* |

Ад слоў левага слупка пастаўце пытанні да слоў правага слупка.

Запішыце, якім бывае яблык.



Правообладатель Национальный институт образования

Словы, якія называюць прыметы прадметаў, адказваюць на пытанні які? якая? якое? якія?: *белы* (снег), *вясёлая* (усмешка), *цёплыя* (дні), *лагоднае* (сонейка).

**166.** Прачытайце верш.

Я вясну малюю,
фарбаў не шкадую.
Колерам зялёным —
дрэва і палеткі,
колерам чырвоным —
сонейка і кветкі,
колерам блакітным —
неба, ручаіну.
А якую фарбу
воблачку пакіну?

*П. Прануза.*

Якія колеры пераважаюць вясной? Якога колеру воблачка?

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Выпішыце ў алфавітным парадку словы — назвы колераў вясны.



Правообладатель Национальный институт образования

**167.** Адгадайце загадку.




Хмара дробны дожджык сее,
сонца ярка свеціць,
у сем колераў квітнее
што? — Скажыце, дзеці.

*У. Мацвеенка.*

Знайдзіце ў загадцы слова, якое называе прымету прадмета. Назавіце колеры вясёлкі.

**168.** Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

*цвёрды*

Сцежка (я к а я?) вузкая, а дарога … .
Снег (я к і?) мяккі, а лёд … .
Перац (я к і?) горкі, а цукар … .
Дрэва (я к о е?) высокае, а куст … .

С л о в ы д л я д а в е д к і: *шырокая, салодкі, нізкі, цвёрды.*

Запішыце сказ, у якім сустрэліся слоўнікавыя словы. Падкрэсліце словы, якія называюць прыметы прадметаў.

У з о р. *Сцежка вузкая, а дарога шырокая.*



Правообладатель Национальный институт образования



**169.** Па прыкметах адгадайце, пра што гаворыцца ў загадцы.

З*(е/я)*лёны мех,
а ў ім — чырвоны сне*(г/х)*.
*А. Клышка.*



Спішыце загадку, устаўляючы патрэбныя літары ў словы.

У класе або дома праверце па перакладным слоўніку, ці правільна вы назвалі слова-адгадку.

**170.** Да слоў — назваў прымет прадметаў падбярыце словы — назвы прадметаў. Запішыце спалучэнні слоў па ўзоры.



летняя чырвоная шаўковая …



маленькае чорнае гуллівае …



новы пругкі футбольны …



прыгожыя дзіцячыя сонечныя …

У з о р: *летняя чырвоная шаўковая сукенка, …*



Правообладатель Национальный институт образования

**171.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

**Летні дзень год корміць.**

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.

Падкрэсліце слова, якое абазначае прымету прадмета. Вусна пастаўце да яго пытанне.

**172.** Прачытайце. Выберыце з дужак словы, якія дапамагаюць апісаць летняе надвор'е.

## Летам

Быў *(цёплы/халодны)* дзень. Стаяла *(сонечнае/пахмурнае)* надвор'е. Дзеці пабеглі на рэчку. Яны купаліся ў *(цёплай/сцюдзёнай)* вадзе.

Назавіце ў сказах словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў. Вусна пастаўце да іх пытанні.

**173.** Да слоў з правага слупка падбярыце словы з левага слупка.

| | |
|---|---|
| сырое | *плашч* |
| мокры | *надвор'е* |



Правообладатель Национальный институт образования

| | |
|---|---|
| духмяная<br>пахучы | *бэз*<br>*булка* |
| старажытная<br>старое | *крэпасць*<br>*вядро* |

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

1. У ... надвор'е лепш пасядзець дома. 2. У кветніку расцвіў ... бэз. 3. У час экскурсіі дзеці наведалі ... крэпасць.

Запішыце два сказы на выбар. Падкрэсліце словы, якія называюць прыметы прадметаў. Вусна пастаўце да іх пытанні.



**174.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Выкарыстайце словы для даведкі.

Наляцеў ... вецер. Неба зацягнулі ... хмары. ЗаблісКалі ... маланкі. Раскацiста прагрымеў гром. Як з вядра паліў ... ... дождж.

Словы для даведкі: *моцны, яркія, чорныя, цёплы, летні.*

Запішыце тэкст. Падкрэсліце словы, якія называюць прыметы прадметаў.



Правообладатель Национальный институт образования